# КАПЫЛЬСКАЯ АЗБУКА

















Дзяржаўная ўстанова культуры
“Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А.Астрэйкі”

# КАПЫЛЬСКАЯ АЗБУКА

2017

**Наш родны кут – Капыльшчына!**

Мы ведаем, ёсць на беларускай зямлі мясціны прыгожыя і знакамітыя, але няма такіх, як нашы, праслаўленыя ў вершах, легендах, песнях.

**КАПЫЛЬСКАЯ АЗБУКА** (азбука – гэта першая і самая важная кніга ў жыцці кожнага чалавека) дапаможа вам згадаць непаўторнасць Капыльшчыны, данесці да сучаснікаў і нашчадкаў гістарычную і культурную спадчыну нашага краю, выхаваць любоў да яго.

**Шаноўныя сябры!**

**Перад вамі даведнік “КАПЫЛЬСКАЯ АЗБУКА”. Мы спадзяёмся, што ён добра паспрыяе вашым памкненням да больш глыбокага пазнання свайго роднага краю.**

**Капыльшчына дала гісторыі выдатных дзеячоў літаратуры і гісторыі, мастацтва і культуры, многія з якіх сёння вядомы далёка за межамі Беларусі. У Капылі, напрыклад, нарадзіўся раданачальнік і класік новай яўрэйскай літаратуры Мендэле Мойхер-Сфорым, Зоф’я Тшчачкоўская, якая пісала і па-польску, і па-беларуску, родам з Дарагавіцы. На Капыльшчыне нарадзіўся і класік беларускай літаратуры Кузьма Чорны.**

**Агульнавядомы факт – калі быў утвораны часовы рабоча-сялянскі ўрад Беларусі, яго ўзначаліў ураджэнец Капыля - Зміцер Жылуновіч, ён жа – вядомы беларускі пісьменнік Цішка Гартны. Аднак аб тым, што два народныя камісары ва ўрадзе таксама былі з Капыля, ведаюць далёка не ўсе. У Капылі была адна з самых моцных на Беларусі ячэек арганізацыі РСДРП, тут жа – выпадак унікальны – выдаваліся рукапісныя часопісы.**

**І, безумоўна, адна з самых яркіх старонак гісторыі Капыльшчыны – Вялікая Айчынная вайна. 10 Герояў Савецкага Саюза – ураджэнцы Капыльшчыны. У раёне дзейнічала і выйшла з яго 12 партызанскіх брыгад. Адзін з першых піянераў-герояў – з Капыльшчыны таксама.**

**Капыльшчына дала Айчыне вядомых вучоных і дактароў медыцынскіх навук Н.В.Станкевіча, А.А.Торыка, М.А.Лушчыцкага, які быў галоўным хірургам ваенна-марскога флоту былога СССР. Заявілі аб сабе і вучоныя В.В.Раманенка, М.А.Манак і В.І.Валынец.**

**Гэта ўсевядомыя факты. Ёсць і такія, пра якія ніхто не чуў…**

**Капыль быў вядомы і ў Еўропе. Выдатны картограф Себасцьян Мюнстэр адзначыў яго на карце 1540 года. На карце Гедройця, якая была змешчана ў геаграфічным атласе Абрагама Артэліуса (1574г.) Капыль таксама паказаны. А вось Слуцка і Мінска там няма.**

**А які яшчэ раён можа пахваліцца тым, што ў ЗША ёсць цэлы горад, які поўнасцю насяляюць выхадцы з Капыльскага раёна.**

**У пачатку ХУІІ стагоддзя на Капыльшчыне некалькі гадоў жыў асветнік-гуманіст эпохі Адраджэння Данііл Набароўскі – вучань самога Галілея.**

**У пачатку ХІХ стагоддзя ў Капылі нарадзіўся адзін з самых знакамітых урачоў Расіі, доктар медыцынскіх навук Самуіл Кушалеўскі. Ён уваходзіў у пяцёрку лепшых медыкаў Расійскай Імперыі.**

**Падчас Паўночнай вайны са шведамі жыхары Капыльшчыны страцілі трэцюю сваю частку. Сам рускі цар Пётр I удзельнічаў у баях са шведамі ў ваколіцах Капыля.**

**Адна са звестак, зусім нядаўна выйшаўшая з глыбінь гісторыі – Капыльшчына (вёска Вусава) – Радзіма Міколы Гусоўскага, аўтара помніка беларускай пісьменнасці "Песня пра зубра", які ўвайшоў у скарбніцу Еўрапейскай культуры, імя якога рашэннем міжнароднай арганізацыі ЮНЭСКА, было ўключана ў спіс найвыдатнейшых дзеячоў славянскага свету. Аднак гэта імя намі ў работу не ўнесена, паколькі даследчая работа ў гэтым напрамку працягваецца.**

**Капыль - Радзіма вядомага ўсяму свету сваім "Чорным квадратам" Казіміра Малевіча. Дарэчы, толькі дзякуючы актыўнай дапамозе ў даследванні гэтага факта мясцовых краеведаў, вывучэнні захаваўшыхся архіўных матэрыялаў краязнаўчага музея, архіваў выданняў мясцовай газеты "Слава працы", актыўнага супрацоўніцтва з вядомымі людзьмі – выхадцамі з Капыльшчыны, гэты факт падцвердзіўся. Сёння ў нас ёсць яшчэ адна падстава гонару за сваю зямлю – Радзіма вядомага ўсяму свету аўтара "Чорнага квадрата" Казіміра Малевіча - мястэчка Капыль.**

**Эдвард Вайніловіч, заснавальнік Чырвонага касцёла – архітэктурнай жамчужыны Беларусі, якой 21 лістапада 2015 года споўнілася 105 гадоў, таксама з нашых мясцін.**

**Давайце цяпер разам з вамі ўспомнім памятныя значкі-маячкі, якія пакідалі нашы продкі на шляху з мінулага ў будучае, якія яднаюць дзень учарашні з днем сённяшнім.**

**Усё гэта з'явілася падставай для ўвасаблення ў жыццё новага выдання. "КАПЫЛЬСКАЯ АЗБУКА" – кніга даведачнага характару, якоя ў алфавітным парадку змяшчае звесткі аб лепшых прадстаўніках Капыльшчыны, якія ўнеслі свой уклад у нацыянальную спадчыну. Галоўнай мэтай выдання - было акамуляваць звесткі аб іх у адзінае цэлае і данесці да кожнага, каго зацікавіць гісторыя Капыльшчыны.**

**Таццяна Астрэйка**



Уладзімір Альгердавіч – адзін з дынастыіі Алелькаў, першых уладальнікаў Капыля



Князі Алелькавічы : Аляксандр, Сямён, Міхаіл, князёўны пінскія Аляксандра (Олена), Соф'я






# Астрэйка А.

## Я –родам з-пад Капыля



*Здалек, за верст, магчыма, пяць*
*Ажно з Рымлянскае гары,*
*Мой гарадок Капыль відаць,*
*Яго будынкі і двары.*

*Яго старыя курганы*
*Мо, не адну стаілі быль*
*Пра дні бяды, пра дні вайны,*
*Як рос, змагаўся мой Капыль.*

*У гэтым горадзе не раз*
*Для твораў любасць і цяпло*
*У светлы свой юнацкі час*
*Збіралі Гартны і Гурло.*

*Хаця не давялося ім*
*Дажыць да пераможных дзен.*
*Яны наказвалі жывым*
*Занесці Капылю паклон.*

*Паміж руінаў я стаю.*
*Што крок – магілы пры сцяне.*
*Слязу ў вачах я не таю,*
*Так горка і балюча мне.*

*Паклон магілам дарагім,*
*Табе паклон, мая зямля.*
*Я шчыра ганаруся тым,*
*Што родам сам з-пад Капыля.*

***(1945)***



***Адамовіч Алесь (Аляксандр Міхайлавіч) (03.09.1927 – 26.01.1994)*** *– пісьменнік, крытык, літаратуразнаўца. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Канюхі*** *Капыльскага раёна.*



***Айзенберг Рыгор Захаравіч (17.12.1904 – 31.03.1994) –*** *доктар тэхнічных навук, прафесар. Вучоны ў галіне электрадынамікі і связі. Лаурэат Ленінскай, Сталінскай і Дзяржаўнай прэмій, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі РСФСР. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Цімкавічы*** *Капыльскага раёна.*



***Александровіч Сцяпан Хусейнавіч (15.12.1921 – 1.05.1986)*** *– празаік, крытык, літаратуразнавец, вучоны, прафесар, доктар філалагічных навук. Заслужаны работнік культуры Беларусі. Нарадзіўся ў* ***Капылі.***



***Андруковіч Фёдар Аляксандравіч (12.02.1909 – 1.03.1964)*** *– оперны спявак, стваральнік незабыўных вобразаў у творах рускіх, заходнееўрапейскіх і савецкіх кампазітараў. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Цімкавічы*** *Капыльскага раёна*



***Астрэйка Анатоль (Акім Пятровіч) (24.07.1911 – 23.08.1978)*** *– паэт, перакладчык.. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Пясочнае*** *Капыльскага раёна.*



***Астрэйка Сяргей Адамавіч (26.06.1912 – 14.09.1937) –*** *паэт****.*** *Скончыў Мінскі беларускі педагагічны тэхнікум у 1930г. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Каласоўшчына*** *Капыльскага раёна.*



***Афяроўскі Аляксандр Рыгоравіч (01.05.1937) –*** *пісьменнік****.*** *Нарадзіўся ў вёсцы* ***Рулёва*** *Капыльскага раена.*



***Ачапоўскі Міхаіл Мікалаевіч (11.05.1788 – 21.01.1854)*** *– вучоны-аграбіёлаг, эканаміст, гісторык, прафесар Імператарскага Варшаўскага ўніверсітэта Нарадзіўся ў вёсцы* ***Пацейкі*** *Капыльскага раёна.*

# *Бывайце здаровы!*









*“Божы след” – старажытная сведка гісторыі зямлі капыльскай, культавы валун.*

# БЫВАЙЦЕ ЗДАРОВЫ

Музыка Ісака Любана
Словы Адама Русака




*Бывайце здаровы,*
*Жывіце багата,*
*Ужо ж мы паедзем*
*Да сваёй хаты.*
*Ў зялёнай дубраве*
*Мы начаваць будзем.*
*Эх! Вашае ласкі*
*Вавек не забудзем.*

*У вашым калгасе*
*Шырокае поле,*
*Няхай жа на шчасце*
*Цвіце ваша доля.*
*На рэчках на вашых*
*Бурлілі бы воды,*
*Каб плавалі з крыкам*
*Гусей карагоды.*

*Каб жыта у полі*
*Трубою вілося,*
*Каб сала у хаце*
*Кублами вялося.*
*Штодзень у капусце*
*Каб плавала скварка,*
*А к скварцы часінай*
*Вялася б і чарка.*

*Яшчэ вам жадаем*
*Прыбытку у хаце -*
*Не мала, не многа -*
*Штогод па дзіцяці.*
*Не будзе вам крыўды*
*Яшчэ і за тое,*
*Калі пашанцуе*
*На год і па двое.*

*Бывайце здаровы,*
*Жывіце багата,*
*А мы ад'язджаем*
*Дадому, дахаты.*





***Бабарэка Адам Антонавіч*** *(**14.10.1899 – 10.10.1938)** – беларускі савецкі пісьменнік, паэт, крытык, настаўнік. Нарадзіўся ў вёсцы **Сладаба-Кучынка** Капыльскага раёна.*



***Багдановіч Міхаіл Мітрафанавіч (20.07.1915 – 13.02.1984)*** *– савецкі і расійскі вучоны ў галіне гідраскапічных і навігацыйных прыбораў. Доктар тэхнічных навук (1965), прафесар (1966). Нарадзіўся ў **Капылі.***



***Багдановіч Іосіф Іларыёнавіч (1882 – 1936)*** *– удзельнік рэвалюцыйнага руху. Палітычны дзеяч. Адзін з арганізатараў Савецкай улады на Капыльшчыне. Нарадзіўся ў **Капылі.***



***Бельскі Алесь Іванавіч (23.07.1963)*** *– беларускі пісьменнік, літаратуразнавец, доктар філалагічных навук (1999), прафесар(1994). Нарадзіўся ў вёсцы **Цімкавічы** Капыльскага раёна.*



**Бельскі Фама Антонавіч (31.10.1890 – 2.03.1952)** *– савецкі, украінскі і беларускі вучоны ў галіне педагогікі і псіхалогіі, краязнавец, педагог. Прафесар педагагічных навук (1925). Нарадзіўся ў вёсцы* ***Цімкавічы*** *Капыльскага раёна.*



**Бокун Іван Антонавіч (1.05.1934**) *доктар тэхнічных навук, прафесар кафедры «Эканоміка і арганізацыя энергетыкі», член-карэспандэнт Беларускай інжынернай акадэміі. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Сцяпуры*** *Капыльскага раёна.*

**Бранавіцкі Віліус Іванавіч (21.03.1936 – 15.12.2004)-** *Заслужаны работнік культуры БССР (1980). Званне прысвоена за шматгадовую творчую працу па развіццю мастацкай самадзейнасці, за канцэртна-выканаўчую дзейнасць, за эстэтычнае выхаванне. Нарадзіўся ў* ***Капылі.***



**Букатая Надзея Іванаўна (3.05.1918 – 3.09.1977)**. *Герой Сацыялістычнай Працы. Нарадзілася ў вёсцы* ***Траянава*** *Капыльскага раёна.*



**Булат Генадзь Мечыслававіч (29.09.1956 – 25.12.1979)** *– воін-інтэрнацыяналіст. Загінуў у Афганістане. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Душава*** *Капыльскага раёна.*


АВ 5636-7




ЭКСПОЗИЦИЯ
Героя Беларуси
академика
Михаила Степановича
ВЫСОЦКОГО




Ксёндз-магістр Уладыслаў Завальнюк
ЭДВАРД
ВАЙНІЛОВІЧ
УСПАМІНЫ, ДАКУМЕНТЫ,
СУВЯЗЬ З СУЧАСНАСЦЮ


Гізэла
Хмялеўская
ЦЕРНІ
КРЭСАЎ


…так
хацеў
Бог…



***Вайтовіч Аляксандр Паўлавіч (5.01.1938) –*** *вучоны, фізік. Доктар фізіка-матэматычных навук(1979). Прафесар(1986). Нарадзіўся ў вёсцы* ***Рачкевічы*** *Капыльскага раёна.*



***Вайцяховіч Валянцін Паўлавіч (23.02.1956 – 29.05.1982) –*** *воін-інтэрнацыяналіст. Загінуў у Афганістане. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Дусаеўшчына*** *Капыльскага раёна.*



***Варвашэня Іван Дзянісавіч (31.12.1904 – 4.03.1957)*** *– партыйны і дзяржаўны дзеяч БССР. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў камуністычнага падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Мінскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Сакратар Мінскага ГК КПБ. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Быстрыца*** *Капыльскага раёна.*



***Высоцкі Міхаіл Сцяпанавіч (10.02.1928 – 25.02.2013) –*** *акадэмік АН Беларусі, вучоны ў галіне машынабудавання. Амерыканскі біяграфічны інстытут унёс прозвішча акадэміка Высоцкага ў спіс 5000 вучоных, якія зрабілі вялікі ўклад у развіцце навукі XX стагоддзя. “Чалавек года – 1997”. 1 сакавіка 2006 года акадэміку М.С.Высоцкаму прысвоена званне Героя Беларусі Нарадзіўся ў вёсцы* ***Семежава*** *Капыльскага раёна. На радзіме адкрыты музей М.С.Высоцкага.*



***Выскварка Арсеній Мікалаевіч (28.06.1924 – 1989)*** *– Герой Сацыялістычнай Працы. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Блеўчыцы*** *Капыльскага раёна.*














Г

Зацверджана:
Рашэннем Капыльскага раённага
выканаўчага камітэта № 120
ад 05.09.2011 г.

# ГІМН
# г.Капыля і Капыльскага раёна

Музыка С.Ждановіча                Словы М Кожуха, С.Ждановіча



**Горад былых вякоў,**
**Спадчына родная.**
**Праца тваіх сыноў –**
**Годнасць народная!**

Прыпеў:
***Капыльская зямля мая,***
***Крыніца слаўнага жыцця.***
***Мой лёс, мой гонар, зорны шлях,***
***Радзіма, слаўся ты ў вяках!***

**Мужнасці продкаў быль.**
**Часам не знішчана**
**Вера мая – Капыль,**
**Зорка на Міншчыне!**

Прыпеў:
***Капыльская зямля мая,***
***Крыніца слаўнага жыцця.***
***Мой лёс, мой гонар, зорны шлях,***
***Радзіма, слаўся ты ў вяках!***

***Галубовіч Генадзь Міхайлавіч (19.09.1934 – 24.04.1992) –*** *мастак, афарміцель кніг, член Саюза мастакоў. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Вялешына****. На радзіме створаны музей Г.М.Галубовіча.*

***Галушка Васіль Міхайлавіч (15.15.1936)*** *– вучоны ў галіне сельскагаспадарчых навук, член карэспандэнт НАН Беларусі і Акадэміі аграрных навук Беларусі. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Дамантавічы*** *Капыльскага раёна.*

***Ганчар Анатоль Андрэевіч (1940) –*** *дацэнт, кандыдат тэхнічных навук. Нарадзіўся ў* ***Капылі****.*



***Гартны Цішка*** *(****Зміцер Хведаравіч Жылуновіч****)* ***(04.11.1887 –11.04.1937)*** *– паэт, празаік, драматург, публіцыст, дзяржаўны і грамадскі дзеяч, акадэмік АН Беларусі(1928). Нарадзіўся ў* ***Капылі.***

***Герман Мікалай Мікалаевіч (7.05.1923 – 1991) –*** *Герой Сацыялістычнай Працы. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Жавалкі*** *Капыльскага раёна.*

***Германовіч Іван Клімавіч (28.02.1928 – 28.03.2001) –*** *вучоны, мовазнаўца, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры БДУ, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі 1998 года. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Садавічы*** *Капыльскага раёна.*



***Гілеп Уладзімір Аляксандравіч (11.03.1938)*** *– старшыня беларускага фонду культуры. Старшыня БАА “Міжнароднага савета па ахове помнікаў і гістарычных месц”. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Вострава*** *Капыльскага раёна.*



***Гладкая Валянціна Фёдараўна (16.04.1956)*** *– спявачка, мастацкі кіраўнік, салістка народнага фальклорна-этнаграфічнага ансамбля “Неруш”. Заслужаны дзеяч культуры Беларусі. Нарадзілася ў вёсцы* ***Праснакі*** *Капыльскага раёна.*



***Грыб Аляксандр Маркавіч (1.04.1921 – 14.07.2002)*** *– Герой Савецкага Саюза. Палкоўнік запасу. Нарадзіўся ў вёсцы **Крывасёлкі** Капыльскага раёна.*

***Гурвіч Навум Лазаравіч (15.04.1905 – 25.12.1981) –*** *доктар медыцынскіх навук. Заснавальнік тэорыі фібрыляцыі і дэфібрыляцыі сэрца. Нарадзіўся ў вёсцы **Цімкавічы** Капыльскага раёна.*



***Гурло Алесь (Аляксандр Кандратавіч) (19.01.1892 – 4.02.1938***) *- паэт, празаік, перакладчык. Нарадзіўся ў **Капылі***



***Гурло Аляксей Васільевіч (27.09.1894 – 30.01.1960) –*** *першы рэктар Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта. Нарадзіўся ў **Капылі.***



***Гурскі Антон Іванавіч (14.01.1936 – 1.07.2016)*** *- вучоны, мовазнаўца, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры БДУ, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі 1986 года. Нарадзіўся ў вёсцы **Лугавая** Капыльскага раёна.*



***Гурскі Канстанцін Іванавіч (21.11.1907 – 17.02.1943)*** *– кандыдат філалагічных навук, заснавальнік беларускага мовазнаўства. Даследваў беларускі правапіс і марфалогію. Нарадзіўся ў вёсцы **Лугавая** Капылькага раёна. Загінуў на фронце.*

***Гурскі Мікалай Іванавіч (4.06.1905 – 5.07.1972) –*** *беларускі савецкі мовазнаўца. Кандыдат філалагічных навук(1950), прафесар. Даследваў пытанні беларускага, рускага і славянскага мовазнаўства. Нарадзіўся ў вёсцы **Лугавая** Капыльскага раёна.*
















Д

***Русак А.***

## КАПЫЛЬСКІЯ ДУДАРЫ

У Капылі на гары
Заігралі дудары.
Перша дудка — салавейкам,
А другая — канарэйкай,
Трэцяя — пяе-варкуе,
А чацвёртая — кукуе,
Пятая — дык польку грае
Аж у скокі паднімае.

А хто ж тыя дудары?
Прыглядзіся, разбяры.
Дзве Алёны — дзве даяркі,
Дзве Настулі —дзве свінаркі,
Дзве закройшчыцы Марылі,
Што ад песень замарылі.
Два Іваны — слесары,
Два Пятрусі — сталяры.

Пра што граюць дудары?
Ты паслухай, разбяры:
Дзве Алёны — пра каханне,
Дзве Настулі — пра спатканне,
Дзве Марылі — пра вяселле,
Слесары — пра навасельле,
Сталяры — пра навіну,
Што ўлюбіліся ў адну.

Слухаў гранне дзед Лявон:
Мне і старасць не закон,
Калі песня душу грэе,
Калі сэрца маладзее.
Дай жа тупну з весялосці,
Каб не нылі мае косці.
Ад капыльскіх дудароў
Буду молад і здароў.

*1968*





***Далгін Ісак Маркавіч (15.12.1910 – 21.06.1988) –*** *доктар геаграфічных навук, прафесар Ленінградскага арктычнага інстытута АН СССР. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Цімкавічы*** *Капыльскага раёна.*



***Даманская Міхаліна Адамаўна (1875-18.03.1936) –*** *класік польскай літаратуры, навелістка, грамадскі дзеяч.*

*Нарадзілася ў вёсцы* ***Чыжэвічы*** *Капыльскага раена.*

***Дземідовіч Алесь (Аляксандр) Пілінавіч (23.04.1897 – 5.11.1965)*** *– савецкі, татарскі і беларускі аграном-селекцыянер, беларускі грамадскі дзеяч, паэт. Доктар сельскагаспадарчых навук(1949), прафесар (1950). Нарадзіўся ў* ***Капылі****.*



***Драздовіч Вікенцій Іосіфавіч (15.08.1911 – 3.12.1942)*** *– Герой Савецкага Саюза. Удзельнік Лаўскага бою, камандзір узвода. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Навасёлкі*** *Бабаўнянскага сельсавета Капыльскага раёна.*

***Драко Валерый Уладзіміравіч (19.05.1946) –*** *педагог, выдатнік народнай адукацыі. Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Саўкова*** *Капыльскага раёна.*

***Дрожжа Людміла Яўгенаўна*** *пісьменніца. Нарадзілася ў вёсцы* ***Рымашы*** *Капыльскага раёна.*



***Дубовік Мікола (28.07.1905 – 30.06.1928) – паэт.*** *Нарадзіўся ў вёсцы* ***Мурыны*** *Капыльскага раёна.*



***Дубовік Сяргей Валянцінавіч (16.08.1952)*** *– празаік. Дырэктар інстытута журналістыкі БДУ, кандыдат філалагічных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Крыніца*** *Капыльскага раёна.*

Є



Жальба і смутак...

Помнік ахвярам фашызму на месцы спаленай в.Жавалкі.

Ж



Жылуновіч Змiцер Фёдаравіч – старшыня першага Беларускага ўраду.



Замкавая гара ў Капылі

З

І

***Емельянаў Валерый Мікалаевіч (9.01.1941) –*** *савецкі і расійскі вучоны ў галіне гарэння гетэрагенных кандэнсаваных сістэм. Доктар тэхнічных навук (1987), прафесар (1994), член карэспандэнт Расійскай акадэміі прыродазнаўчых навук, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1989), Прэміі Ўрада Расійскай Федэрацыі ў галіне навукі і тэхнікі (2009). Нарадзіўся ў* ***Капылі.***

***Жалкоўскі Яўген Аляксандравіч (12.09.1938 – 3.05.2011)*** *– савецкі расійскі вучоны ў галіне геадэзіі, картаграфіі, геаінфарматыкі, экалагічнай бяспекі. Доктар тэхнічных навук (1990), прафесар (1994), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР(1985), Прэміі Урада Расійскай Федэрацыі ў галіне навукі і тэхнікі (2007). Нарадзіўся ў вёсцы* ***Асавец*** *Капыльскага раёна.*



***Зяневіч Міхаіл Вікенцьевіч (23.05.1939)*** *– расійскі вучоны ў галіне педыятрыі, пульманалогіі, педагог. Доктар медыцынскіх навук (1987), прафесар (1990), заслужаны ўрач Расійскай Федэрацыі(1993), палкоўнік медыцынскай службы(1987). Нарадзіўся ў вёсцы* ***Дусаеўшчына*** *Капыльскага раёна.*

***Іодка Адам Адамавіч (17.05.1944 – 23.10.1996)*** *– савецкі і расійскі ваеначальнік, генерал-маёр. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Бор*** *Капыльскага раёна.*

## Капыльская крынічка











## рэчка Каменка





# К



Ц. ГАРТНЫ

# КАПЫЛЬ

Капыль,Капыль! Маё мястэчка,
Вялікай Міншчыны куток!
Мне міла ўсё тваё: і рэчка,
І хаты, нівы і гаёк…
Вакол яго снуе далінай
Шнурок вясёлы раўчука,
Якога нам, бы матка сына,
Спакон вякоў дала рака,
Што там магутна воду гнала
І чоўны рэзвыя нясла,
Бурлівай хваляй узгорак рвала
І крыгай мост стары трасла…
А далей – вокал роўна нівы
Свае шнуркі к гаям вядуць,
Што цёплым летам людзям жніва
За працу цяжкую даюць.
На нівах густа разраслісь
Астаткі шведскае вайны,
Што ў час вяковы не звяліся
Ў траве зяленай курганы.
Пад іх грамадаю маўкліва
Ваякаў слаўных косці спяць,
Пайшоўшых смела ў час прызыву
Свой родны край абараняць.
Між тых курганаў, на адгону,
Высокі замак з цьмы вякоў
Устае, як сведка ўлады і закону
Старых часоў, сваіх князеў.
Калі ж паглядам далей кінем
Туды, дзе ніў канец ляжыць,-
Хваёвы бор, як вострым клінам,
Сцяной зялёнаю стаіць.
Старыя хаткі сумна зніклі
З зялёным мохам на страсе,
І спяць-маўчаць, нібы прыціхлі,
Як завароржаны ўсе…



**Каваленя Аляксандр Аляксандравіч (14.03.1946)** *– беларускі гісторык і педагог. Доктар гістарычных навук(2000), прафесар. Скончыў Мінскі педагагічны інстытут(1975). Нарадзіўся ў* **Капылі.**



**Казлоўскі Ігнат Ігнатавіч (2.02.1917 – 8.06.1962)** *– Герой Савецкага Саюза. Нарадзіўся ў вёсцы* **Вялікія Прусы** *Капыльскага раёна.*

**Калацкі Валерый Іванавіч (17.09.1944 – 19.11.1996) –** *расійскі вучоны ў галіне акеаналогіі, прыкладной гідрафізікі і аховы навакольнага асяроддзя. Доктар фізіка-матэматычных навук (1988), прафесар (1990). Заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі РФ(1995). Нарадзіўся ў вёсцы* **Садавічы** *Капыльскага раёна.*



**Калевіч Дзмітрый Іванавіч (5.02.1967 – 19.01.1986)** *– воін-інтэрнацыяналіст. Нарадзіўся ў вёсцы* **Нізкавічы** *Капыльскага раёна*

**Каляда Канстанцін Уладзіміравіч (25.10.1941) –** *беларускі вучоны ў галіне раслінаводства. Доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар. Нарадзіўся у вёсцы* **Старыца** *Капыльскага раёна.*



**Кананові Іван Іванавіч (10.05.1938) – пісьменнік.**

*Нарадзіўся ў вёсцы* **Какорычы** *Капыльскага раена.*



**Кандраценя Уладзімір Ігнатавіч (03.1917 – 23.02.1943) –** *беларускі пісьменнік.*

*Нарадзіўся і пахаваны ў вёсцы* **Смалічы** *Капыльскага раена.*

***Карпіленя Мікалай Васільевіч (12.08.1960)*** *– расійскі вучоны ў галіне ваеннай бяспекі, педагог. Доктар ваенных навук (2008), дацэнт (2003), палкоўнік. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Дзярэчына*** *Капыльскага раёна.*



***Карповіч Аляксандр Аляксандравіч (5.05.1946 – 13.06.1982) –*** *воін-інтэрнацыяналіст. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Выня*** *Капыльскага раёна.*

***Кіеня Аляксандр Іванавіч (29.04.1938) –*** *беларускі вучоны. Доктар біялагічных навук(1987), прафесар (1988), Скончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут(1968). Аўтар шэрагу навуковых прац. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Малінаўка*** *Капыльскага раёна.*

***Кіеня Макар Аляксандравіч (21.09.1899*** *– невядома)* ***–*** *інжынер-будаўнік мастоў. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Домантавічы*** *Капыльскага раёна.*

***Кісель Віктар Паўлавіч (15.05.1941)*** *– доктар гістарычных навук. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Ст.Капыль.***



***Кіш Алена (1896 – 1949) –*** *майстар дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.*

*Назвы дываноў “Рай”, “Дзева на водах”, “Пісьмо каханаму”, “Каля возера”, “Райскі сад”. Звесткі пра жыццевы і творчы шлях мастачкі-самавучкі сабраны дзякуючы намаганням мастака Уладзіміра Басалыгі. Нарадзілася ў мястэчку Раманава Слуцкага павета. Доўгі час жыла ў вёсцы* ***Грозава*** *Капыльскага раёна, там і пахавана.*



***Клейнбарт Леў Максімавіч (15(27).10.1875 – 20.11.1950) –*** *рускі савецкі крытык, публіцыст. Нарадзіўся ў* ***Капылі.***



***Клішэвіч Міхаіл Якаўлевіч (19.06.1937)*** *– інжынер па радыёэлектроніцы, кандыдат тэхнічных навук, дацэнт, прафесар, палкоўнік запаса. Напісаў паэму “Искатель». Нарадзіўся ў вёсцы* ***Пукава (Камсамольскае)*** *Капыльскага раёна.*



***Кныш Рэнальд Іванавіч (10.09.1931) –*** *Заслужаны трэнер Беларусі з 1960 года, заслужаны трэнер СССР з 1964 г. Заслужаны дзеяч фізічнай культуры Беларусі з 1971 года. Нарадзіўся ў* ***Капылі.***



***Копцік Іван Канстанцінавіч (27.09.1936) –*** *доктар сельскагаспадарчых навук. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі ў галіне навукі і тэхнікі 1998 года. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Рачкевічы*** *Капыльскага раёна.*

***Корсакаў Уладзімір Уладзіміравіч (7.01.1949) –*** *галоўны канструктар, начальнік упраўлення галоўнага Дзяржаўнага прадпрыемства “Мінскі аўтамабільны завод “ПО “Белаўтамаз”. Нарадзіўся у* ***г. Капылі.***



***Коршак Аляксей Ігнатавіч (22.02.1920 – 27.02.1945)*** *– паэт. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Закопанка*** *Капыльскага раена. Загінуў ва Усходняй Прусіі пад паселішчам Ласлейндорф.*

***Кот Дзмітрый Якаўлевіч (7.11.1897 – 1937)*** *– нарком хімічнай прамысловасці. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Малыя Прусы*** *Капыльскага раёна.*

***Красоўскі Антон Якаўлевіч (13.03.1821 – 13.04.1898***) *- расійскі вучоны ў галіне гінекалогіі і акушэрства, педагог, грамадскі дзеяч. Доктар медыцыны(1852), ардынарны прафесар Імператарскай акадэміі(1858), ганаровы лейб-акушэр(1866), акадэмік (1872) правадзейны тайны саветнік(1896). Нарадзіўся ў мястэчку* ***Грозава*** *Капыльскага раёна.*

***Красоўскі Людвіг Якаўлевіч (13.10.1825 – 28.01.1906)*** *– расійскі вучоны і ўрач-практык у галіне інфекцыйных хвароб і эпідэміялогіі ў Персіі, грамадскі дзеяч, доктар медыцыны(1855). Нарадзіўся ў мястэчку* ***Грозава*** *Капыльскага раёна.*



***Красуцкі Яўген Іванавіч (1918 – 17.03.1944)*** *– Герой Савецкага Саюза. Нарадзіўся у г.Петраградзе. Дзіцячыя гады прайшлі ў* ***Капылі****.*



*М.Савіцкі “Лаўскі бой”*



*Увекавечанне Лаўскага бою ў нашы дні.*




Л

## Легенда пра Капыль



...Даўно гэта было. Многа соцень гадоў таму на месцы Капыля стаяў замак багатага князя. Непадалёку ад замка цякла рэчка, якая разлівалася шырокім возерам каля княжых палацаў. У князя была адна дачка, ды такой прыгажосці, што князь надзвычай ганарыўся ёю і не дазваляў, каб на яе пазіралі простыя людзі.

Князёўна жыла ў святліцы, якая была ў высокай замкавай вежы. Адтуль яна магла пазіраць праз вакно на навакольны свет, любавацца хараством палёў, лесу, ракі. Звалі князёўну Паліна, або проста Поля. Аднойчы, летам, каля замка з'явіўся малады пастух, які вельмі хораша іграў на дудачцы, якую ён сам і зрабіў. Князёўна пачула дзіўную песню дудара і вельмі зацікавілася музыкам і яго ігрою. Яна пераапранулася ў сялянскую дзяўчыну і непрыкметна выйшла з вежы і прыбегла на бераг возера, дзе пастух пасвіў свой статак. Тут яна ўбачыла прыгожага юнака, які, угледзеўшы прыгажуню-дзяўчыну, не мог адвесці вачэй ад яе. Ён адразу пакахаў яе, як толькі ўбачыў, і зайграў так, што ўсё навокал было зачаравана тою ігрою. Коля (так звалі пастуха) дамовіўся з Поляй, што ноччу, як толькі ўзыдзе месяц, яны будуць катацца на чоўне па возеры. Князь быў у паходзе, і яны так сустракаліся некаторы час. Вярнуўшыся з паходу, князь даведаўся аб сустрэчах закаханых. Князёўну замкнулі ў вежы. Бацькі яе меркавалі выдаць замуж за багатага прынца. І вось у канцы лета ў цёмную рабінавую ноч, калі палыхала навальніца і бушавала возера, пастух падплыў на чаўне па возеры да самага замка і на жалейцы падаў голас сваёй каханай. Князёўне ўдалося выбрацца з вежы, і маладыя людзі кінуліся наўцёкі.

Стража падняла шум. Князь падняў на ногі ўсю чэлядзь, каб злавіць уцекачоў. Ён убачыў дачку і пастуха на чаўне сярод хваль, калі возера асвяціла бліскавіца. І зноў усё знікла ў непрагляднай цемры. Мала-памалу навальніца прайшла, а як стала зусім светла, на возеры нікога ўжо не было. Возера паглынула ўцекачоў. Тады ў роспачы бацька пракляў і возера, і рэчку, якія ў той самы момант праваліліся ў зямлю. Месца гэтае пасля таго сталі клікаць па імені закаханых: Колі і Полі — Ко-Поль, а пазней Капыль, ды так і засталося — Капыль. І сёння Капыль.

***Лагвіновіч Фёдар Фёдаравіч (1937 – 1.09.2015) –*** *Заслужаны работнік культуры БССР (1981). Званне прысвоена за вялікі ўклад у развіццё кінемастацтва. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Пясочнае*** *Капыльскага раёна.*

***Ліневіч Антон Уладзіміравіч (23.10.1933 – 29.08.2011)*** *– савецкі і расійскі вучоны-эканаміст у галіне тарыфікацыі працы. Доктар эканамічных навук (1981), прафесар(1986). Нарадзіўся ў вёсцы* ***Роспы*** *Капыльскага раёна.*

***Лобік Лявон Сцяпанавіч (1871 – 1918)*** *– беларускі паэт, публіцыст. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Кукавічы*** *Капыльскага раёна.*



***Лушчыцкі Іван Мікалаевіч (20.01.1907 – 9.09.1973) –*** *беларускі савецкі вучоны. Член карэспандэнт АН БССР(1969), доктар філасофскіх навук(1952), прафесар (1953). Заслужаны дзеяч навукі БССР. Аўтар шматлікіх навуковых прац. Нарадзіўся вёсцы* ***Агароднікі*** *Капыльскага раёна.*

***Лушчыцкі Міхаіл Аляксеевіч (10.02.1919 – 10.03.1999) –*** *савецкі і расійскі вучоны ў галіне ваенна-марской і шпітальной хірургіі, арганізатар ваенна-марской медыцынскай акадэміі, педагог. Доктор медыцынскіх навук(1961), прафесар(1969). Нарадзіўся ў вёсцы* ***Калоўка*** *Капыльскага раёна.*



***Ляшчынскі Адам Браніслававіч (24.12.1920 – 8.09.2006)*** *– Герой Савецкага Саюза. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Якубавічы*** *Капыльскага раёна.*

***Ляўко Анатоль Ігнатавіч (15.04.1948) –*** *доктар сацыялагічных навук(1992), прафесар(1994). Закончыў БДУ. З 1990 года працаваў у Нацыянальным інстытуце адукацыі Міністэрства адукацыі РБ. З 2000 года загадчык аддзела Інстытута сацыяльна – палітычных даследванняў пры Адміністрацыі Прэзідэнта РБ. З 2004 года – у Акадэміі МВД РБ. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Астравок*** *Капыльскага раёна.*

***Ляўко Вольга Мікалаеўна (21.05.1947) –*** *археолаг, кандыдат гістарычных навук, старэйшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН Беларусі. Нарадзілася ў вёсцы* ***Астравок*** *Капыльскага раёна.*



*Тут зязюлі маўчаць*
*І падснежнікі плачуць...*

*(Помнік на месцы спаленай вёскі Масявічы)*






*Эйда Мазэ (Іда Жукоўская)*






*К.Малевіч "Чорны квадрат"*




fotobel.by



**Мазэ Эйза (09.07.1893 – 13.06.1962)** – *яўрэйская пісьменніца. Нарадзілася ў вёсцы* ***Вуглы*** *Капыльскага раёна.*



**Максіменя Іосіф Маркавіч (16.08.1912 – 15.08.1964) –** *Герой Савецкага Саюза. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Старына*** *Капыльскага раёна.*

**Макаронак Уладзімір Аляксандравіч (23.08.1926 – 29.08.1982)** – *Герой Сацыялістычнай Працы. Нарадзіўся ў в.Падвішаванне Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці. Жыў і працаваў у вёсцы* ***Дусаеўшчына*** *Капыльскага раёна.*

**Малевіч Ігар Аляксандравіч (13.11.1941)** – *прафесар, доктар фізіка-матэматычных навук. Нарадзіўся ў г.Мінску. Дзіцячыя і юнацкія гады прайшлі ў* ***Капылі.***



**Малевіч Казімір Севярынавіч (23.02.1879 – 15.05.1935)** – *расійскі, украінскі, беларускі мастак. Тэарэтык мастацтва, філосаф, педагог. Нарадзіўся ў* ***Капылі.***



**Манак Мікалай Андрэевіч (20.06.1943) –** *дырэктар Беларускага НДІ кардыялогіі. Кардыятэрапеўт. Доктар медыцынскіх навук, прафесар. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Семежава*** *Капыльскага раёна.*



***Марціновіч Алесь Андрэевіч (18.08.1946)*** – *пісьменнік, крытык, літаратуразнавец. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь (1998). Нарадзіўся ў вёсцы* ***Казловічы*** *Капыльскага раена.*



***Міхалковіч Генадзь Васільевіч (5.051965 – 15.12.1985)*** – *воін-інтэрнацыяналіст. Нардзіўся ў вёсцы* ***Мацкевічы*** *Капыльскага раёна.*



***Міхальчук Сяргей Апанасавіч (14.08.1925 – 19.07.1995) –*** *пісьменнік, перакладчык. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Скабін*** *Капыльскага раена.*



***Мэндэле Мойхер-Сфорым (Абрамовіч Шолам Якаў) (20.12.1836 – 8.12.1917)*** – *яўрэйскі пісьменнік. Пачынальнік крытычнага рэалізму ў яўрэйскай літаратуры. Нарадзіўся ў* ***Капылі.***



*"... Нёман, і песня і слава*
*Народа майго і зямлі ..."*

*А.Астрэйка*








Н

О

## ***ПЕСНЯ ПРА НЁМАН***

*Сл. А. Астрэйкі* *Муз. Н. Сакалоўскага*



*Ой, Нёман, і песня і слава*
*Народа майго і зямлі,*
*Магілаю ворагам цеснай*
*Не раз твае хвалі былі.*

*Рака наша слаўная Нёман,*
*Чысцейшая чэрвеньскіх рос,*
*Хто мар не ўплятаў у твой гоман,*
*Табе хто пашаны не нёс?*

*Ой, Нёман, ой, бацька наш родны,*
*Як сонца, як дзень, дарагі,*
*Садамі цудоўнай Радзімы*
*Твае расцвілі берагі.*





***Набароўскі Даніла (1573 – 1640)*** *– паэт, дыпламат, урач. Нарадзіўся ў Кракаве (Польшча). Жыў у* ***Капылі.***



***Наржымскі Уладзімір Аляксандравіч (14.02.1915 – 17.10.1988)*** *– Герой Савецкага Саюза. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Цімкавічы*** *Капыльскага раёна.*



***Наркевіч Аркадзь Іосіфавіч (10.03.1929 – 13.10.2002) –*** *беларускі мовазнавец, доктар філалагічных навук(1974), прафесар(1976). Скончыў Мінскі педагагічны інстытут(1951). Аўтар шэрагу дапаможнікаў для вышэйшых навучальных устаноў. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Варонаўшчына*** *Капыльскага раёна.*



***Наркевіч-Ёдка Вітольд Аляксандравіч (4.01.1835 – 22.10.1924)*** *– афтальмолаг, доктар медыцыны. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Камсамольскае*** *Капыльскага раёна.*



***Наркевіч-Ёдка Якуб Антонавіч (8.01.1848 – 19.02.1905) –*** *вучоны, прыродазнаўца, медык, прафесар. Нарадзіўся ў маёнтку* ***Наднёман****, на мяжы Капыльскага і Уздзенскага раёнаў.*

***Наркевіч-Ёдка Ян Сільвестр (24.02.1845 – пасля 1918) –*** *інжынер-будаўнік мастоў. Нарадзіўся у вёсцы* ***Кацельнікі*** *Капыльскага раёна.*



***Нахмановіч Аляксандр Львовіч (15.10.1924 – 14.05.1996)*** *– казахскі спецыяліст ў галіне сельскай гаспадаркі. Грамадскі дзеяч. Герой Сацыялістычнай Працы. Нарадзіўся у вёсцы* ***Пузава (Вясёлае)*** *Капыльскага раёна.*



***Новікаў Валяр'ян Пятровіч (18.02.1951 – 17.01.1986)*** *– воін-інтэрнацыяналіст. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Садавічы*** *Капыльскага раёна.*

***Нікульская Ганна Гаўрылаўна (1.01.1915 – 14.07.1994) –*** *Герой Сацыялістычнай Працы. Нарадзілася ў в.Рудня Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці. Жыла і працавала ў вёсцы* ***Дусаеўшчына*** *Капыльскага раёна.*



***Нячаеў Арсеній Аляксеевіч (10.12.1910 – 7.04.1989) –*** *Герой Савецкага Саюза. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Блеўчыцы*** *Капыльскага раёна.*



***Ордзін Вілор Мікалаевіч (12.12.1939)*** *– прамысловец, вучоны ў галіне эканомікі, грамадскі і палітычны дзеяч. Кандыдат эканамічных навук (2003). Нарадзіўся ў вёсцы* ***Цімкавічы*** *Капыльскага раёна.*

## У.М.Пасюкевіч “Роднаму гораду прысвячаецца”











П

***ЛЕАНАРД ПАДГОРСКІ-АКОЛАЎ***

***...Як я аглух ад бразганіны***
***Па маставаой і па каменні***
***Засну і сняцца лугавіны***
***Хваёвы лес і дом з бярвення...***

***Нішто мне болей тут не ўцешна,***
***Нічому тут душа не рада.***
***І заграніца – жмінда-цешча,***
***Што Рым хвалёны, што Элада.***

***Адна мне ўцеха тут – з пагорка***
***Вачыма ўпіцца не ў Акропаль,***
***А ў той, што муціць позірк горка –***
***У мой замглелы даллю КОПЫЛЬ.***





***Падгорскі-Аколаў Леанард (21.12.1891 – 4.01.1957)** – польскі паэт, перакладчык, літаратуразнавец. Нарадзіўся ў вёсцы **Дусаеўшчына** Капыльскага раена.*

***Падневіч Рыгор Фёдаравіч (28.02.1931)** – беларускі літаратар.. Нарадзіўся ў вёсцы **Бучаціна** Капыльскага раёна.*



***Паляшчук Ганна Іванаўна (1924)** – мастачка-ткачыха. Нардны майстар. Жыла ў вёсцы **Макраны** Капыльскага раёна.*



***Пасюкевіч Уладзімір Маркавіч (1.03.1931 – 15.05.2009) –** мастак, дацэнт. Член Саюза мастакоў. Карціны і партрэты У.М.Пасюкевіча неаднойчы экспанаваліся на Усесаюзных і рэспубліканскіх выставах. Ілюстрацыі з іх часта змяшчаліся ў часопісах “Беларусь”, “Маладосць” і іншых. Карціны “Капыль будуецца”(1979г.), “Родныя пагоркі”( 1973г.), “Капыльскае возера” прысвечаны родным мясцінам. Нарадзіўся ў **Капылі.***



***Петрусевіч Казімір Адамавіч (2.03.1872 – 14.08.1949)** – грамадска-палітычны дзеяч. Нарадзіўся ў вёсцы **Душава** Капыльскага раёна. Эмігрыраваў у Польшчу.*



***Пешкур Іван Іванавіч (21.12.1921 – 12.10.1980) –** мастак, працаваў у галіне тэатральна-дэкарацыйнага мастацтва. У 1948 г. на Усесаюзным фестывалі за спектакль “Папараць-кветка” І.Пешкур атрымаў дыплом Лаурэата. Працаваў галоўным мастаком Беларускага тэатра юнага гледача. Нарадзіўся ў вёсцы **Вострава** Капыльскага раёна.*

***Пінчук Васіль Андрэевіч (1933) –** Герой Сацыялістычнай працы. Нарадзіўся ў вёсцы **Блеўчыцы** Капыльскага раёна.*

***Пінчук Іван Дзмітрыевіч (2.08.1898)** – генерал Арміі. Нарадзіўся у вёсцы **Цімкавічы** Капыльскага раёна*

***Пратасевіч Вячаслаў Сцяпанавіч (17.04.1913 – 2.11.1992)*** - *беларускі савецкі майстар традыцыйных музычных інструментаў, выканаўца на дудцы, скрыпцы, жалейках з саломкі, кмену і чароту. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Роспы*** *Капыльскага раёна.*

***Пыка Іван Яўгенавіч (13.07.1960)*** *– пісьменнік. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Стараселле*** *Капыльскага раёна.*

***Пятровіч Генадзь Уладзіміравіч (6.06.1926) –*** *беларускі савецкі спявак, бас. Заслужаны артыст БССР з 1971 года. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Дусаеўшчына*** *Капыльскага раёна.*



***Пятровіч Сяргей Астапавіч (12.04.1931 – 6.10.1981) –*** *беларускі савецкі мастацтвазнавец, публіцыст. Нарадзіўся ў* ***Капылі***.







Радзівілы – уладальнікі Капыля



Адам Русак



Хведаровіч М.

# КАПЫЛЬ

Растрэслі вятры
Заляжалы і горкі
Далёкай мінуўшчыны пыл.
Стаіць на пагорках,
На ста сямі горках
Мой родны,
Мой слаўны Капыль.
Гібеў ён ў горы,
Хоць быў непакорны
З нядоляй змагаўся вякі.
З гары і пад гору,
А болей пад гору
Жылі тут мае землякі.
Яны калупалі
Палетак гарысты
Нарогам драўлянай сахі,
Ураднік і прыстаў,
Нядоімкі сысквай
Да скаргі людское глухі.
Зусім недалечка,
Насупраць мястэчка,
Курган адзінокі стаіць
І ў суме адвечным,
Сстуліўшы плечы,
Мінуўшчына ў замчышчы спіць.
Ды праўдзе не спіцца,
Ці ж можна забыцца,
Як сцяг тут агніста шумеў?
Як наш капылянін,
Узняўшы паўстанне,
Складаў рэвалюцыі спеў.
Па вуліцах грузкіх,
Калдобістых, вузкіх
Прайшла неаднойчы вайна,
А колькі ахвяраў
У пашчы пажараў
Тады праглынула яна.

Але не за гэта
Я словам паэта
Праслаўлю,
Капыль мой, цябе
Ты ў горы не здаўся,
А жыў, гартаваўся,
Мужнеўшы ў сваёй барацьбе.
Бяда адступіла,
І ты свае крылы
Шырока ізноў разгарнуў.
Унуку і сыну
Ўручыў ты машыну -
І сілу з іх кожны адчуў.
Палі зарунелі,
Сады зашумелі,
Растуць камяніцы-дамы.
Жыццё маладое
Змяняе старое,
Старэем патрохі і мы.
Як песня, як вершы,
Юнак ці старэйшы,
Мы любім тваю маладосць.
Ідзе мы ні будзем,
Цябе не забудзем,
З нас кожны жаданы твой госць
Мы сэрцам з табою.
Пад гэтай страхою
Мужнела паэтаў сям'я
І ў раннім тумане,
Вясне на спатканне,
Радзілася песня мая.
З той памятнай зоркі,
Збуцвелы і горкі,
Развеяўся спадчыны пыл…
Стаіць на пагорках,
На ста сямі горках
Мой родны ,
Мой слаўны Капыль.



***Рабкевіч Валянцін Іванавіч (15.02.1937 – 6.02.1995) –*** *паэт, перакладчык, крытык. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Аксаміты*** *Капыльскага раена.*



***Радкевіч Аляксандр Іванавіч (26.08.1916 – 17.10.1957)*** *– Герой Савецкага Саюза. Нарадзіўся вёсцы* ***Балгавічы*** *Капыльскага раёна.*



***Ралько Іван Дзмітрыевіч (21.11.1929 – 27.12.1979) –*** *паэт, крытык, літаратуразнавец. У 1958г. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Макраны*** *Капыльскага раена.*

***Раманенка Вальдэмар Віктаравіч (14.03.1937)*** *– беларускі вучоны ў вобласці клінічнай медыцыны. Доктар медыцынскіх навук, прафесар(1991). Нарадзіўся ў вёсцы* ***Цімкавічы*** *Капыльскага раёна.*



***Рамашка Мікалай Васільевіч (13.10.1913 – 30.06.1944)*** *– Герой Савецкага Саюза. Нарадзіўся у вёсцы* ***Дусаеўшчына*** *Капыльскага раёна.*



***Ровенскі Дзмітрый Дзмітрыевіч (5.01.1948)*** *– фальклaрыст**,** музыкант, майстар народных інструментаў. Заслужаны дзеяч культуры Беларусі(1999). Заснавальнік і мастацкі кіраўнік Мінскага ўзорнага фальклорнага ансамбля “Дударыкі”(1970), з 1996 – Мінскага народнага ансамбля народнай музыкі і песні “Мінскія музыкі”. Нарадзіўся ў* ***Капылі.***

***Родчанка Мікалай Віктаравіч (1938)*** *– пісьменнік, педагог. Нарадзіўся у вёсцы* ***Цімкавічы*** *Капыльскага раёна.*



**Родчанка Рыгор Віктаравіч (8.12.1929 – 1994)** – *паэт, публіцыст, фалькларыст, краязнавец, педагог. Дзіцячыя гады прайшлі ў вёсцы* ***Цімкавічы*** *Капыльскага раёна.*

**Родчанка Уладзімір Віктаравіч (18.11.1946) –** *расійскі вучоны ў галіне стварэння і эксплуатацыі лятальных апаратаў. Доктар тэхнічных навук(1991), прафесар,(1994), акадэмік Расійскай акадэміі касманаўтыкі імя К.Э.Цыялкоўскага(2011). Нарадзіўся ў вёсцы* ***Агароднікі*** *Капыльскага раёна.*



**Розін Петр Ісакавіч (15.07.1913 – 1984) –** *савецкі, расійскі і беларускі жывапісец, заслужаны мастак РСФСР. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Вошкаты*** *Капыльскага раёна.*



**Рудніцкі Антон Сяргеевіч (3.01.1943) –** *беларускі вучоны ў вобласці тэарэтычнай і прыкладной электрадынаміцы. Доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Філіпавічы*** *Капыльскага раёна.*



**Русак Адам Герасімавіч (24.05.1904 – 21.03.1987) –** *паэт-песеннік, член Саюза пісьменнікаў, заслужаны работнік культуры Беларусі (1964). Нарадзіўся ў вёсцы* ***Пясочнае*** *Капыльскага раёна.*



**Рылаў Генадзь Пятровіч (7.08.1936 – 2001)** – *доктар сельскагаспадарчых навук, вядомы садавод. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Куцаўшчына*** *Капыльскага раёна.*



**Рымжа Міхаіл Іванавіч (13.10.1947)** – *намеснік міністра аховы здароўя(2004). Доктар медыцынскіх навук, прафесар. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Семежава*** *Капыльскага раёна.*



Спаса-Узнясенская царква

# Т














# У

# Когда я на почте служил ямщиком




Когда я на почте служил ямщиком,
Был молод, имел я силенку,
И крепко же, братцы, в селенье одном
Любил я в ту пору девчонку.

Сначала не чуял я в девке беду,
Потом задурил не на шутку:
Куда ни поеду, куда ни пойду,
Все к милой сверну на минутку.

И любо оно, да покоя-то нет,
А сердце болит все сильнее.
Однажды дает мне начальник пакет:
«Свези, мол, на почту живее!»

Я принял пакет – и скорей на коня,
И по полю вихрем помчался,
А сердце щемит, да щемит у меня,
Как будто с ней век не видался.

И что за причина, понять не могу,
И ветер так воет тоскливо…
И вдруг – словно замер мой конь на бегу,
И в сторону смотрит пугливо.

Забилося сердце сильней у меня,
И глянул вперед я в тревоге,
Потом соскочил с удалого коня, -
И вижу я труп на дороге.

А снег уж совсем ту находку занес,
Метель так и пляшет над трупом.
Разрыл я сугроб-то и к месту прирос,
Мороз заходил под тулупом.

Под снегом-то, братцы, лежала она…
Закрылися карие очи.
Налейте, налейте скорее вина,
Рассказывать больше нет мочи!



**Сілава Святлана Уладзіміраўна (1970)** – *кандыдат гістарычных навук. Нарадзілася ў* ***Капылі.***

**Скрыган Аляксандр Іосіфавіч (11.08.1905 – 28.08.1981)** – *беларускі хімік, доктар хімічных навук (1966), прафесар. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Труханавічы*** *Капыльскага раёна.*



**Скрыган Ян (Іван Аляксеевіч) (16.11.1905 – 18.09.1992) –** *пісьменнік, паэт. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Труханавічы*** *Капыльскага раена.*



**Соркіна Іна Валер'еўна (2.04.1971)** – *гісторык, кандыдат гістарычных навук(1998), дацэнт (2003). Нарадзілася ў* ***Капылі.***



**Сташэўскі Васіль Пятровіч (23.03.1895 – 29.10.1937 ) –** *празаік, драматург. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Лугавая*** *Капыльскага раёна. У 1937 годзе арыштаваны і прыгавароны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны пасмяротна (8.6.1957).*

**Сухій Мікалай Андрэевіч (30.04.1922 – люты 2016)** – *Герой Сацыялістычнай Працы. Нарадзіўся ў вёсцы Княгінін Мядзельскага раёна. Працаваў у* ***Капылі.***



**Сыман Аляксандр Валянцінавіч (26.07.1977) –** *біятланіст. Чэмпіён па біятлону кубка Балтыі - Еўрапейскіх спаборніцтваў. Нарадзіўся ў горадзе* ***Капыль.***



**Сыракомля Уладзіслаў (Кандратовіч Людвіг) (29.09.1823 – 15.09.1862) –** *паэт, перакладчык, драматург, крытык, краязнаўца. Некаторы час жыў у вёсцы* ***Кудзінавічы*** *Капыльскага раёна.*










*Ткацтва*









*Фестываль гульні і гумару "Капыльскія пацехі"*

***Тароцька Уладзімір Іосіфавіч (1919)*** *– канструктар танкаў. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Рымашы*** *Капыльскага раёна.*

***Таўпека Аляксандр Рыгоравіч (1914 – 21.06.1944)*** *– Герой Савецкага Саюза. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Доктаравічы*** *Капыльскага раёна.*

***Трыгубовіч Алімпіяда Адамаўна (1914)*** *– Герой Сацыялістычнай Працы. Нарадзілася вёсцы* ***Леневічы*** *Капыльскага раёна.*

***Тжашчкоўская (Манькоўская) Зоф'я Адамаўна (26.11.1847 – 7.10.1911)*** *– паэтэса, перакладчыца, пісала на польскай і беларускай мовах Нарадзілася ў вёсцы* ***Дарагавіца*** *Капыльскага раена.*

***Умінскі Іван Іванавіч (1.11.1935)*** *– ваенны палкоўнік. Служыў на Байкануры. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Гарнастаева*** *Капыльскага раёна.*



***Умрэйка Сцяпан Андрэевіч (19.12.1908 – 19.06.1978)*** *– беларускі савецкі вучоны ў галіне педагогікі. Прафесар(1972). Заслужаны настаўнік Беларусі(1971). Аўтар прац па выхаванніі школазнаўства і выхавання. Узнагароджаны 4 ордэнамі. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Пясочнае*** *Капыльскага раёна*

# Храмы Капыльшчыны



Свята-троіцкая царква
в.Цялядавічы



Георгіеўская царква
в.Лешня



Царква Нараджэння
Божай Маці, в.Васільчыцы



Царква Пакрова Прасвятой
Багародзіцы, в.Пясочнае



Царква Пакрова Прасвятой
Багародзіцы, в.Кіявічы



Спаса-Узнясенская царква,
г.Капыль



Царква свяціцеля Мікалая
Цудатворца, в.Цімкавічы



***Хведаровіч Мікола (Мікалай Фёдаравіч Чарнушэвіч) (24.3.1904 – 20.08.1981)*** *– паэт, празаік, перакладчык. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі (1934). Нарадзіўся ў* ***Капылі.***

***Холад Мікалай Ігнатавіч (5.02.1937)*** *– беларускі вучоны, эканаміст, доктар эканамічных навук, прафесар. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Садавічы*** *Капыльскага раёна.*

## Калядны абрад “Цары”
## в.Семежава

Ц














Ч

“… Цімкавічы, Вялікая Раёўка, Жавалкі…
Родныя мае мясціны.
Як мая душа рвецца туды!
Яна заўсёды там.
Там жывуць усе мае персанажы.
Усе дарогі, пейзажы, дрэвы, хаты,
чалавечыя натуры,
пра якія я калі-небудзь пісаў.
Гэта ўсё адтуль, сапраўднае…»

*Кузьма Чорны.*





***Чаркас Леанід Антонавіч (1.01.1937)*** *– доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Доктаравічы*** *Капыльскага раёна.*

***Чарнушэвіч Аляксандр Анікеевіч (1899 – 29.10.1937)*** *– беларускі паэт, дзяржаўны дзеяч, Нарком асветы. Нарадзіўся ў* ***Капылі.***



***Чарнушэвіч Нічыпар Федаравіч (14.11.1900 – 18.02.1967) –*** *паэт, перакладчык, драматург. Член Саюза пісьменнікаў(1957). Нарадзіўся ў* ***Капылі.***



***Чарнышэвіч Мікалай Антонавіч (20.06.1896 – 19.01.1968)*** *– генерал-маёр. Удзельнік Грамадзянскай вайны, вайны з Фінляндыяй, увода савецкіх войск у Іран (1941). Нарадзіўся ў* ***Капылі****.*



***Чорны Кузьма (Раманоўскі Мікалай Карлавіч) (24.06.1900 – 22.11.1944) –*** *празаік, драматург, публіцыст. Член саюза пісьменнікаў. Нарадзіўся ў фальварку* ***Лапацічы (зараз В.Жабчава)*** *Капыльскага раёна.*

***Чэрнікові́ч Мікалай Васільевіч (студзень 1936)*** *– пісьменнік. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Смалічы*** *Капыльскага раёна*



***Чыгір Васіль Федаравіч (8.09.1924-)*** *– прафесар, заслужаны юрыст БССР. Доктар юрыдычных навук. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Лешня*** *Капыльскага раена.*

***Чыркун Міхаіл Пятровіч (27.02.1926)*** *– беларускі дзеяч культуры. Педагог. Заслужаны работнік культуры. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Браткава*** *Капыльскага раёна.*




Э

Щ





Я

# Ой, мяцеліца

*Словы А.Дзеружынскага* *Музыка М.Шуміліна*

**Ой, мяцеліца,**
**Ой, мяцеліца,**
**Ўсе дарожкі замяла.**
**Як мне, дзеўчыне,**
**Як мне, дзеўчыне,** *2 разы*
**Ехаць з любым да сяла?**

**Я сняжыначкі,**
**Я сняжыначкі**
**Сваім сэрцам растаплю.**
**Ведай, міленькі,**
**Ведай, міленькі,** *2 разы*
**Цябе моцна я люблю.**

**Ой, мяцеліца,**
**Ой, мяцеліца**
**Адгуляла – і пайшла...**
**А вяселейка,**
**А вяселейка** *2 разы*
**Едзе з песняй да сяла.**





***Шакун Леў Міхайлавіч (14.09.1926 – 6.10.1996) –*** *доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры беларускай мовы, заслужаны работнік вышэйшай школы Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР 1986 года. Аўтар вучэбных дапаможнікаў для вышэйшых навучальных устаноў і шматлікіх прац па праблемах развіцця беларускай літаратурнай мовы. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Браткава*** *Капыльскага раёна.*



***Шаціла Яраслаў Сяргеевіч (13.04.1955)*** *– расійскі вучоны ў галіне эксплуатацыі ракетнай тэхнікі, выкарыстання інфармацыйных тэхналогій, абароны інфармацыі, педагог. Кандыдат тэхнічных навук(1991), дацэнт(1993). Палкоўнік(1996). Нарадзіўся ў* ***Капылі.***



***Шкадарэвіч Аляксей Пятровіч (27.10.1947) –*** *доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Нарадзіўся ў* ***Капылі.***

***Шкляр Яфрэм Ільіч (1871 – 1943) –*** *савецкі і яўрэйскі кампазітар, дырыжор, музыкант педагог. Нарадзіўся ў* ***Цімкавічы*** *Капыльскага раёна.*



***Шумілін Міхаіл Міхайлавіч (23.04.1930 – 1959) –*** *кампазітар****.*** *Нарадзіўся ў вёсцы* ***Кукавічы*** *Капыльскага раёна.*



***Янушка Анатолій Давыдавіч (16.01.1930)*** *– беларускі вучоны-лесавод, эканаміст. Доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар. Нарадзіўся ў вёсцы* ***Цялядавічы*** *Капыльскага раёна.*

***Ясючэня Уладзімір Мікалаевіч (17.11.1925 – 12.03.1945)*** *– паэт. Нарадзіўся у вёсцы* ***Станькі*** *Капыльскага раёна.*

**КАПЫЛЮ**

*На стромкай гары,*
*Падпярэзаны рэчкай,*
*Як помнік былога,*
*Як быль,*
*Стаіць на зямлі*
*Беларускай мястэчка*
*Пад сціплаю назвай*
*Капыль.*

*Яго ахінулі*
*Зялёным абдымкам,*
*Пяшчотна к сабе*
*Прытулілі сады,*
*Бы зорнаю ночкай*
*Нявесту-дзяўчынку*
*Бывае галубіць*
*Хлапец малады.*

*Люблю як вясной*
*Ты красуешся ў белі,*
*Пялесткамі снежнымі*
*Сыплецца цвет,*
*Люблю тваіх вуліц*
*Зяленых танэлі,*
*Гаворку капыльскіх*
*Кабет.*

*Я знаю напэўна,*
*Ды гэта не дзіва,*
*На свеце ёсць многа*
*Мясцін прыгажэй.*
*Ды толькі Капыль-*
*Дарагая радзіма,*
*У тысячу раз*
*За чужое мілей.*

*З дзіцячых гадоў*
*Я табой ганаруся.*
*І дзе б не блукай-*
*Хоць за тысячу міль…*
*Я век не забуду,*
*Што я з Беларусі,*
*А іменна: родам*
*З мястэчка Капыль.*



**Пятровіч С.**